

**Жоржы ды Сэна/ Jorge de Sena** (1919 – 1978) – Партугальскі празаік, паэт, драматург, крытык, эсэіст, перакладчык. Адзін з найбуйнейшых партугальскіх інтэлектуалаў другой паловы XX стагоддзя. Узнагароджаны міжнароднай паэтычнай прэміяй Этна-Таарміна, а таксама двума нацыянальнымі ордэнамі (Ордэнам Генрыха Мараплаўца і Ордэнам святога Якава).

# Чаму ў Дзеда Мароза белая барада
(A razão de o Pai Natal ter barbas brancas)

Для філосафаў – у якасці дэманалагічнага разважання аб вершы VIII “Пастух” Албэрту Каэйру.

Для вялікіх дзетак – у якасці вясёлай прытчы.

Для маленькіх хлопчыкаў – у якасці сапраўднай каляднай гісторыі.

## I

Усе ведаюць, а хлопчыкі як ніхто іншы, што Каляды – вельмі даўняе свята. Але не ўсе ведаюць, што спачатку не было ніякага Дзеда Мароза, і тым больш ён не быў стары і таму ў яго не было белай барады. Дык вось, калі нарадзіўся хлопчык Ісус, усе хлопчыкі падвешвалі да коміна боцік.

Адзіная розніца была ў тым, што комін ішоў не ад газавай пліты ці печкі, як цяпер. Да таго ж, у хлопчыка Ісуса, было яшчэ адно адрозненне: ён таксама падвешваў боцік, які ў яго выпадку быў сандаліяй.

Ці доўга гэта працягвалася? Не, таму што хлопчык Ісус вырастае і робіцца мужчынам тады, калі іншыя хлопчыкі вырастаюць і пачынаюць лічыць сябе мужчынамі. Гэта, праўда, здараецца не з усімі, у чым у хлопчыкаў будзе шмат часу ўпэўніцца. Але гэта ўжо іншая гісторыя, пра якую яны даведваюцца пасля, хаця ніхто яе не расказвае.

Тое, пра што я раскажу, пачалося, калі хлопчыку Ісусу павінна было споўніцца сем гадоў. Узрост вельмі важны, уважаючы, што існуе сем цудаў свету. Хлопчык Ісус, як і іншыя хлопчыкі, хацеў стаць дарослым і не верыў ні ў якога Мароза. Ён добра ведаў, хто клаў цацкі ў сандалію (гэта была маці), і паколькі тады не было цацачных крамаў, а нават калі б і былі, бацькі Ісуса не мелі грошай, каб набыць яму цацкі (цацкі ўжо былі вельмі дарагія), ён здагадваўся, што святы Іосіф употайкі робіць для яго калясачку. Таму тым надвячоркам, такім доўгім, якімі заўжды бываюць вечары перад каляднай ноччу, ноччу, у сваю чаргу, самай доўгай за ўвесь год, якая тым і заслугоўвала назвы Каляднае Ночы, таму, як ужо казалася, хлопчык Ісус



prajdzisvet.org

чакаў, калі яму падораць каляску і прыкідваўся, што яму абыякава, прыкідваўся, што нічога не чакае. Вечар быў цудоўны, як мне расказвалі, і гэта натуральна: Мароз павінен быў стаць дзедам і, што яшчэ важней, займець сваю белую бараду. Неба рабілася зялёным, жоўтым і ружовым – колеры, якія дарослыя не любяць бачыць у небе і якія – усе хлопчыкі ведаюць – выразна на ім бачныя. Хлопчык Ісус, канечне, бачыў іх лепей за іншых. І каб прыхаваць гэта, ён пачаў лічыць асобныя воблачкі, якія застылі на месцы, адмыслова спыніўшыся, каб ён іх палічыў, не падазраючы, што зараз адбудзецца. Хлопчык Ісус усеўся на камень (той камень дагэтуль знаходзіцца на яго зямлі, толькі ніхто не ведае, які менавіта ёсць тым самым) на ўзбочкы дарогі, і выводзіў палачкай (якая не была чароўнай, бо толькі феям патрэбныя такія рэчы) малюнкі ў пыле. Пыл, няшчасны, быў самым брудным з усяго, бо з раніцы ішоў дождж, а ў сонца не было часу яго высушыць. Так хлопчык Ісус паглядаў раз-пораз на неба, а потым на зямлю, і любы недалёкі чалавек адразу б зразумеў, што ён малюе воблачкі. Але відаць, зразумець такое вельмі цяжка, пра што хлопчыкі здагадваюцца па дурнаватых пытаннях, якія задаюць ім дарослыя.

– Што гэта ты тут малюеш?

Хлопчык Ісус павярнуўся (такія пытанні заўжды задаюць з-за спіны) і ўбачыў прыгожа апранутага чалавека, хаця тое выглядала на падман. Хлопчык не падмануўся, бо пытанне садрала адзежы з чалавека і пакінула яго расхрыстанага ў адным споднім.

– Вось, малюю.

– Я бачу. А што?

– Проста малюю.

Твар чалавека зрабіўся вельмі злосным, і хлопчык Ісус пераставіў ногі так, каб у выпадку неабходнасці можна было раптоўна падхапіцца і кінуцца на ўцёкі.

– Ты нешта задумаў, але мяне не падманеш.

Хлопчык Ісус, які ўжо шмат разоў падманваў розных людзей, усміхнуўся, але толькі ўнутры, бо твар чалавека быў злосны.

– А што, нельга маляваць? – запытаўся ён.

– Нельга! Давай праверым.

Хлопчык Ісус не паверыў і правёў рысачку, вельмі маленькую. І якім жа было яго здзіўленне, калі ён убачыў, што палачка прыстала да зямлі. Убачыць не ўбачыў, але падняць яе не змог.

Канечне, на гэты раз пасмяяўся ўжо чалавек. А як вядома, д’ябал не можа смяяцца надта доўга, бо з роту праз смех выходзіць сера. Так і адбылося. Хлопчык Ісус пачуў пах, пабачыў дымок, што веяў з роту. Была ўжо амаль ноч (сцямнела амаль раптоўна), нікога не было на дарозе, ён быў далекавата ад дому, і нягледзячы на тое, кім ён быў, хлопчык баяўся, вельмі баяўся, нават больш, чым д’ябал.

Бачыце, у якое цяжкое становішча трапіў хлопчык Ісус? Што б зрабіў любы хлопчык? Відавочна, не падаваў бы выгляду, што баіцца, – гэта



prajdzisvet.org

найлепшы спосаб адпужаць нячыстага. Так ён і зрабіў. Прыкінуўся, што палачка яму больш не патрэбная (хаця яна яму падабалася, бо была прыгожая і вельмі роўная), і сказаў:

– Ладна, час мне вяртацца дадому.

– Ах, так? Навошта? – д’ябал сачыў, калі ж той здасца.

– Там мяне Мароз чакае.

Д’ябал хацеў разрагатацца, але прыгнечаны дымам, які выходзіў праз смех і выдаваў яго, закусіў вусны і спытаў:

– Мароз? Што за Мароз такі?

– Можна падумаць, ты не ведаеш хто гэта! – усклікнуў хлопчык Ісус і паспрабаваў падняцца. Але дзе там! Ён быў прымацаваны да камня, як палачка да бруднай зямлі. Сур’ёзны выпадак! Хоць бы хтосьці прайшоў міма! Але хто? Ні жывой душы, на якія д’ябал не зважае, ні людзей. І паколькі ў той час яшчэ не было святых, да якіх можна было звярнуцца, а Дзева Марыя была дома, хлопчык Ісус, хаця і ведаў, што ён хлопчык Ісус, але не ведаў, што ён сын Божы, не мог уратавацца. Не мог!.. Вось таму, што ён быў такім самым хлопчыкам, як іншыя, яму прыйшла бліскучая ідэя. Небяспечны, але адзіны сродак.

– Дасі мне руку? Дапаможаш падняцца?

Менавіта тое, чаго жадаў д’ябал! З вачыма, якія свяціліся задавальненнем, д’ябал працягнуў яму руку. Найгорш было забыць – а д’ябал тады быў ве-ельмі няпамятлівы – моцна трымацца на нагах. Хлопчык, як толькі той падаў яму руку, змог падняцца… і раз – паставіў нагу праміж дзвюх д’яблавых і даў яму кухталя. Бездапаможны д’ябал (такі, якім ён заўжды і ёсць, не забывайцеся) матлянуў рукамі і плюхнуўся ў бруд, які ў гэтым месцы быў добра змяшаны коламі, нібы прызначаны для д’яблавай задніцы. А калі ён падняўся, раз’юшаны, увесь перапэцканы, хлопчык Ісус ужо быў далёка – здавалася, на ступаках выраслі крылы. Уваходзячы у дом, задыхаючыся, хлопчык Ісус азірнуўся і ўбачыў водбліскі злосці ў начной цемрадзі.

## II

Хлопчык Ісус нікому нічога не сказаў. Ён так радаваўся, што распластаў д’ябла пасярод дарогі! Але ўсё ж адно яго турбавала: д’ябал ведаў, што ён чакае Мароза, таму што ён сказаў, што Мароз яго чакае – але ж д’ябал усё разумее наадварот, і таму даведаецца праўду. Ён непазбежна з’явіцца ў начной цішы, пераапрануты на новы лад, каб яго не пазналі. Ён дакладна прыйдзе. А зараз? Зараз…

## III

Позняй ноччу хлопчык Ісус, які лёг спаць з адным расплюшчаным вокам, а другім заплюшчаным, пачуў, як бацькі падымаюцца і ідуць, крок за крокам, да каміна, куды ён, зразумела, перад тым як легчы спаць, павесіў сандалію з правай нагі. Вядома, гэтая сандалія заўжды лепшая за другую, і



prajdzisvet.org

трэба ёй аддаваць перавагу ва ўсім: у дымаходах, кухталях і г.д., калі толькі ты не ляўшун у нагах, што здараецца вельмі рэдка.

Хлопчык Ісус павярнуўся спіной да каміна, бо было халодна і яшчэ таму, што калі б ён ляжаў тварам, то адразу было б бачна, што ён не спіць і пільнуе. Ясна, што дом быў вельмі малы і бедны і пакой быў толькі адзін, падзелены на два вельмі старымі шторамі, якія Дзева Марыя стамлялася цыраваць, а хлопчык Ісус дзіравіць. Цяпер, як толькі бацькі леглі спаць, хлопчык Ісус сеў у ложку, які, такі ж маленькі, як і дом, складаўся з матраца на падлозе і нешматлікай бялізны. Настолькі нешматлікай, што хлопчык рэдка распранаўся, тым болей узімку. Гэта, бясспрэчна, дрэнная звычка, але зіма – таксама дрэнная звычка, якая, акрамя таго што давала адпачыць зямлі, нязменна паўтаралася кожны год: хлопчык Ісус, нягледзячы на тое, што яму было толькі сем гадоў, ужо добра ведаў, што калі было халодна, акрамя холаду больш нічога не было. Ён сеў, аднак, у ложку. Агонь у каміне паціху згасаў, было бачна, як прабягаюць успышкі па дровах, адна за адной, а краі паленаў робяцца белымі. Д’ябал бы там не затрымаўся. Рыпенне. Хлопчык Ісус паглядзеў на дзверы. Нікога. Затым ён адчуў крокі па ўтаптанай зямлі. Паглядзеў – гэта была мыш. Мыш перабегла з аднаго кута ў другі (а што, калі мыш – гэта замаскіраваны д’ябал?), упэўніўшыся, што гэтыя жабракі нават у калядную ноч не ўпусцілі ні крошкі. Прайшло шмат часу – а хлопчыку Ісусу падалося невыносна шмат – здаецца, ніколі не скончыцца. А што калі… ён улезе праз комін. Вой, улезе! Агонь паціху затухаў, нічога не было відаць. Але для таго, хто палезе праз комін, святла хопіць. І хапіла: паказаліся сандаліі, ногі, аблямоўка чырвонай тунікі (гэта д’ябал, падумаў хлопчык Ісус), сама чырвоная туніка, яшчэ чырвоная туніка, пакуль постаць не стала на ногі збоку ад агню і зрабіла некалькі крокаў у сярэдзіну дому. На плячах была торба. Гэта быў д’ябал! Хлопчык Ісус адчуў... уявіце, што ён адчуў, бо ў глыбіні душы, глыбока-глыбока, ён спадзяваўся, што д’ябал не вернецца. Але ён тут, з торбай і астатнім. Ён убачыў, як д’ябал схіліўся і ўзяў калясачку, якая ляжала ў сандаліі. Трэба сказаць, што каляска была невялікая, але і не вельмі малая, і хутчэй сандалія змяшчалася ў калясцы, чым каляска ў сандаліі. Не, толькі не гэта! У яго ніколі не было цацак, хіба толькі тыя, якія ён сам выдумляў і майстраваў, а гэтую, такую прыгожую, хоча адабраць д’ябал! Ды нават калі яна непрыгожая, ён яе не аддасць. Цацкі для д’ябла! Усе ведаюць, што д’ябал не гуляе ў цацкі і таму робіць усялякія глупствы! Не, толькі не гэта! Ён выскачыў з ложка, падбег да каміна… і выхапіў калясачку з рук нячыстага, які ўжо раскрыў торбу, не зважаючы на хлопчыка.

– Добры вечар! – прамовіў д’ябал салодкім голасам.

– Добры вечар… Чаму вы праз дзверы не ўвайшлі? Трэба было толькі пагрукаць, і я адчыніў бы, – сказаў хлопчык Ісус, закрываючы каляску рукой.

– Каб нікога не пабудзіць…

– А я не спаў.

А д’ябал, вельмі шчыра, як быццам гэта быў не ён:

– Ай, якая прыгожая каляска! Хто табе падарыў?

– А вам што за справа?! Што вам трэба?

– Я толькі хацеў пагуляцца з каляскай. Дасі мне пагуляцца крышачку?

– І не сорамна такому вялікаму ды гуляцца? (так казала яму маці, калі ён бегаў па хаце са сваімі цацкамі).

– Мне? Сорамна? – д’ябал хацеў разрагатацца, але ўзгадаў пра небяспеку выдаць сябе подыхам серы праз смех. – Дык не дасі мне пагуляцца?

Хлопчык Ісус пахітаў галавой, не знаходзячы спосабу выратавацца. Калі б толькі ён…

– Усё-ткі хочаце? Ну толькі крышачку.

– У што? У што? (д’ябал быў цалкам задаволены).

– Я буду вознік, а вы – конь.

– Давай! Давай! – д’ябал адразу стаў на карачкі, каб упрэгчыся ў каляску.

Каляска была зробленая вельмі добра, усё было на месцы, нават збруя. Вось тады хлопчык Ісус, прыкмеціўшы белую бараду, якая была ў д’ябла (барада насамрэч была неймавернай белізны), ясна зразумеў, што яму трэба рабіць. Многія мяркуюць, што д’ябал можа змяніць свой выгляд да непазнавальнасці і схаваць усё, акрамя казліных капытоў. Выяўляецца, гэта няпраўда, як можна даведацца з гэтай гісторыі, дзе ён з’яўляецца ў сандаліях, з голымі нагамі. Калі б гэта былі яго ногі ці пазычаныя ў кагосьці, хлопчыку Ісусу трэба было б лепей падумаць. А ён падумаў і сказаў:

– Я не магу накінуць на цябе аброць (ён звяртаўся да яго на “ты” не таму, што ён быў д’ябал, а таму што д’ябал граў каня), у цябе такая доўгая барада! І такая прыгожая, яна ж пашкодзіцца!

І вораг ганарліва прызнаўся:

– Прыгожая, праўда? Яна мне шмат каштавала.

Хлопчык Ісус ужо здагадаўся, чаго той хацеў. І зноў загаварыў:

– Я не магу табе накінуць аброць, але калі не накіну, то як жа ты пацягнеш каляску?

Д’ябал, у якога не было ні кроплі цярпення (і таму гэта лёгка заўважыць па тым, як ён пачынае курчыцца), хацеў хучэй скончыць тую пародыю, тым больш што яму здавалася, што хлопчык Ісус ужо здагадаўся, хто ён (толькі *здавалася*, таму што д’ябал ніколі ні ў чым не ўпэўнены). Вось таму ён прапанаваў:

– Дык я падыму бараду, а ты надзенеш аброць…

Так і зрабілі. А калі д’ябал падняў бараду, хлопчык Ісус убачыў скурчаную казліную бародку, якой д’яблу ніколі не пазбавіцца, як відавочна. Белая барада, неверагодна бялюткая, вядома, была накладная.

Як толькі д’ябал быў добра запрэжаны, хлопчык Ісус, упэўнены, што д’ябал знікне і пакіне каляску, вымавіў нейкае вядомае яму таемнае слова (усе хлопчыкі ведаюць такія словы, але не ведаюць, якое падыдзе). Д’ябал застаўся на месцы. Тады хлопчык Ісус вымавіў іншае. І зноў нічога. Ці



prajdzisvet.org

збіраецца хлопчык Ісус вымавіць трэцяе, пытае д’ябал, ужо засумаваўшы, быццам бы ён падлічваў:

– Што гэта за гульня такая, што ніяк не пачнецца?

Хлопчык Ісус пацягнуў за бараду і выгукнуў трэцяе слова, найбольш моцнае з усіх… Д’ябал вухнуў, як машыны перад тым, як торгацца з месца, і панёсся праз дзверы вонкі з такой сілай, такой, такой, такой, што ён з каляскай ў момант апынуліся за дзвярымі, а тыя нават не скрануліся з месца.

Хлопчык Ісус з накладной барадой у руках асцярожна адчыніў дзверы. Відаць, было не больш за сажань перад носам, але ж ні д’ябла, ні каляскі таксама не было бачна. У гэты момант барада выслізнула з рук хлопчыка і пачала ўздымацца ў неба, расці, расці, і калі яна ўжо была наверсе, дождж паліў як з цэбра. Відавочна, вусамі былі воблачкі, якія лічыў хлопчык Ісус.

Хлопчык вярнуўся ў хату і добра зачыніў дзверы. У хаце нічога не было відаць, таму што агонь згас зусім. Хлопчык Ісус ціхусенька паклаўся ў ложак. Думаючы пра каляску, ён пачуў, як святы Іосіф сказаў: “Ты чула вуханне?” А голас Дзевы Марыі адказаў: “Чула. Спі спакойна. Гэта д’яблавы штукарствы”.

Мама ведала! Хлопчыка Ісуса ахінула найвялікшае, якое толькі магчыма, захапленне сваёй маці.

IV

Але пакольکі калядная ноч бывае ве-е-ельмі доўгай, гісторыя на гэтым не заканчваецца. Тым болей што дасюль невядома, чаму ж Дзед Мароз – дзед і мае вялікую белую бараду.

Хлочык, калі ўлёгся першы раз з адным расплюшчаным вокам, а другім заплюшчаным, цяпер, без каляскі, не мог заплюшчыць ніводнага вока. Ён так хваляваўся… зноў пачуўся шоргат у коміне. Незразумелы шоргат унізе коміна. Гэта было занадта: нахабнік ужо забраў каляску і зноў вяртаецца!

Хлопчык Ісус падняўся, стаў ля каміна, узяў вялікую жалезіну, якая тут ляжала, каб прыбіраць попел. Праз трубу ішло цьмянае святло. З’яўляліся сандаліі… ногі… адзежа… (гэта ён, падумаў хлопчык Ісус) чырвоная туніка… яшчэ чырвоная туніка … пакуль постаць не апынулася тут жа ўзбоч попелу. Хлопчык Ісус падняў жалезіну… і чалавек (здаецца, гэта быў чалавек) сказаў:

– Гэтак ты мяне сустракаеш? Так цябе навучылі сустракаць Мароза?

Вось тады хлопчык заўважыў, што у яго не было барады, ні белай, ні чорнай, і тым больш нічога, што хоць неяк нагадвала бараду. Значыць, гэта быў не д’ябал. Але хлопчык не апусціў жалязяку.

– Але ты праўда ёсць? І заўжды прыходзіш? – ён звяртаўся да яго на “ты” не таму, што ён быў Мароз, а з радасці, што ён не быў д’яблам).

– Я, як ёсць. Вось прыйшоў, як бачыш.

– Цудоўна! Ты мне нешта прынёс?

– Я ніколі нічога не прыношу… Я мяняю цацкі. Менавіта іх я нашу з сабой.



prajdzisvet.org

– Тады ў гэтым годзе я застануся ні з чым, таму што у мяне была каляска, а д’ябал яе забраў.

– Д’ябал?

– Так. Прыйшоў, пераапрануты ў цябе, толькі ў яго была белая барада, і забраў у мяне каляску.

– І ты нічога не зрабіў?

– А што я мог? Ён прычапіўся і не хацеў сыходзіць.

– І як цяпер быць? Я прынёс каляску, каб памяняць.

– А ты не дорыш цацкі дзецям, у якіх няма цацак?

– Не магу.

– Чаму?

– Таму што толькі абменьваю.

– Чаму?

– Таму што не магу падараваць.

Хлопчык Ісус больш не пытаўся. Ён скеміў па адказах, што іншых у Мароза не было. Гэта быў той, хто нікому нічога не дарыць. Але застацца без каляскі не хацелася.

– У цябе ж ёсць мая каляска.

– Ёсць? Дзе?

– Ну сходзі забяры ў д’ябла.

– Ну так, праўда.

– А тады аддай мне тую, якую прынёс.

– А другая?

– А другая твая, скажаш д’яблу, калі яго спаткаеш, і ўсё.

– А калі не спаткаю?

– У цябе яшчэ столькі часу! А ў мяне няма іншай каляскі!

– Добра… Здаецца, ты мяне пераканаў.

І Мароз – а гэта быў ён – паставіў торбу, якую нёс за плячыма (як бачыце, бессаромны д’ябал нават торбу недзе ўзяў), і дастаў адтуль каляску, абсалютна такую ж, як была. Але ж такую самую, такую самую, адзін у адзін. І аддаў хлопчыку, які быў – уявіце сабе – надзвычайна гэтым задаволены. Так задаволены, што адразу ўзгадаў тое-сёе.

– А калі д’ябал зараз зноў дзесьці прыкінецца табой?

– І проста. Не вельмі, але проста.

– Што значыць проста? Што ты будзеш рабіць?

Хлопчык Ісус добра бачыў, што Мароз збянтэжыўся, не ведаючы, што рабіць. Яму стала шкада Мароза, ён жа яму падарыў каляску, і ў адказ ён падаў яму ідэю, якая была вартая большага, чым якая-небудзь каляска.

– Адгадуй сабе белую бараду. Адно з двух: альбо д’ябал будзе хадзіць са сваёй казлінай барадой і ўсе яго пазнаюць, або ён начэпіць накладную бараду, і варта будзе толькі патузаць за яе, каб даведацца, ці сапраўдная яна.

– Цудоўная ідэя, але ж, пане, якая цудоўная ідэя! – ды трошкі падумаўшы, Мароз дадаў:

– Не атрымаецца. Я павінен стаць дзедам.



prajdzisvet.org

– Чаму?

– Таму што д’ябал не можа стаць дзедам.

– Не можа?

– Не можа. Дзеці д’ябла – заўжды дзеці іншых людзей.

– Тады станавіся Дзедам Марозам і адпускай белую бараду.

Словы яшчэ не былі прамоўленыя, як Мароз стаў Дзедам з барадой, якая даходзіла амаль да зямлі, такой белай, такой белай, што святло зыходзіла цяпер ад вусаў.

Пасля гэткага цуду (а гэта быў сапраўдны цуд), хлопчык Ісус страшэнна захацеў спаць, так, каб праспаць усю ноч і яшчэ адну. Дзед Мароз зразумеў гэта, усміхнуўся, дапамог яму легчы ў ложак… Так хлопчык Ісус нават не ўбачыў, як ён сышоў, бо, нягледзячы на цікаўнасць, адразу заснуў. З каляскай пад пахай. Ясна, што д’ябал не вярнуўся… (вось таму дзеткі спяць, учапіўшыся ў цацку, якую яны любяць найбольш).

V

На наступны дзень, на Раство, быў выходны, так, як сёння. Многія выходзілі прагуляцца ў палі, а хлопчык Ісус выходзіў на дарогу, каб пагуляцца з каляскай. Канечне, ён недаверліва глядзеў на ўсе каляскі побач, каб знайсці сярод іх падобную да сваёй. Але ніводнай такой не было. Ён гуляўся, гуляўся і ўжо забыўся на ўсю гэтую гісторыю, калі пабачыў чалавека на адлегласці, у месцы, дзе было найменш людзей. Ён сядзеў на камяні і маляваў на зямлі палачкай. Хлопчык Ісус пашкадаваў яго, хацеў папярэдзіць і падышоў.

Тады хлопчык Ісус размаўляў на рэдкай мове – арамейскай – якую многія яўрэі не разумелі, ды і сёння, як здаецца, не разумеюць. Але ён быў невінаваты. Яго навучылі так, калі ён быў яшчэ маленькі і ледзь пачаў працягваць ручкі… Дзеці да гэтай пары памятаюць жаданне ухапіць штосьці далёкае? Так, сапраўды.

Тым разам адбылося так, што чалавек не толькі не зразумеў, што яму хацеў сказаць хлопчык, але раззлаваўся і прагнаў яго, пагражаючы палкай. Зразумела, што хлопчык Ісус кінуўся на ўцёкі. Калі ён быў ужо даволі далёка, ён азірнуўся... І што ён убачыў?

Каля чалавека спынілася такая самая каляска, як ягоная, якую цягнуў нейкі тыпус. Ён ўжо распачаў размову з тым, хто сядзеў. Здавалася, размова была вельмі вясёлая, бо абодва вельмі смяяліся. Толькі з рота таго, які быў на месцы каня, веяў белы дымок, добра вядомы хлопчыку Ісусу.

Вось пасля ўсяго гэтага Мароз і стаў Дзедам і займеў белую бараду, каб адрозніваца ад таго, хто прыносіць пякельныя цацкі, цацкі, якія – усе дзеці таксама ведаюць – робяцца ў гэтым свеце, як і астатнія цацкі.

Як відаць з гэтай гісторыі, і ў супрацьлегласць таму, што я меркаваў да таго, як пачаў пісаць яе, прычына для таго, каб Дзед Мароз быў дзедам і меў белую бараду, была не адна, іх было многа. Урэшце, не пытайце мяне, чым дзедам ён быў. Не задавайце бязглуздых пытанняў, як дарослыя. Па вялікім



prajdzisvet.org

сакрэце я заўжды кажу, што не ведаю дакладна, а тое, што ведаю, не магу сказаць… ды, зрэшты, магчыма, хлопчыкі даведаюцца больш за мяне.

1944

*пераклад з партугальскай* – Наста Гвоздзева

© Наста Гвоздзева, пераклад, 2009



prajdzisvet.org